# ЗНАЁМЦЕСЯ: КАЛЮЧЫ ІНТРАВЕРТ

**Першая асаблівасць афрыканскага карлікавага вожыка выявілася літаральна перад сустрэчай з гэтым сімпатычным звярком. «Ведаеце, перад чужымі людзьмі ён не раскрыецца — схаваецца ў клубок, пачне бурчаць да той пары, пакуль вы не выйдзеце з пакоя», — заінтрыгавала мяне ўладальніца экзатычнай жывёлы, мінчанка Алеся РАМАНЧЫК.**

**А можа, мне пашанцуе ўбачыць мыску калючыка? Поўная спадзяванняў, іду знаёміцца.**


Усмешка вожыка — найлепшы камплімент для фатографа!

## КЛУБОК, РАСКРЫЙСЯ!

А шостай вечара я на парозе... Вожык «дзеліць» пакой з гаспадарамі, але цяпер тут на дзіва ціха.

— Пачакайце, зараз разбуджу яго, — кажа Алеся і накіроўваецца да вялікага шклянога тэрарыума. У «цераме», закапаўшыся ў фліс (сінтэтычную трыкатажную тканіну), спіць вожык Альс. Гаспадыня адрывае малога ад сну (гэтыя звяркі спяць больш за 12 гадзін), і калючык колеру шампанскага пачынае бурчаць. Адчуўшы новы пах, вожык адразу ж скручваецца ў абаронны клубок. Алеся кладзе цуд на ложак, і мы разам пачынаем цікаваць. Шар з іголак фырчыць, трашчыць, крыху матляецца ў розныя бакі: здаецца, вось-вось выбухне.

— Злуецца: я яго разбудзіла і прывяла «чужынца». Альс гасцей не любіць, — тлумачыць гаспадыня гадаванца гаспадыня. Каб заглядзіць віну перад буркуном, Алеся дастае з бляшанкі парачку «чарвякоў», якія, на самай справе, аказваюцца лічынкамі жука заафобуса. Сапраўдны далікатэс для карлікавых вожыкаў! У спакойных умовах Альс адразу вынюхвае смакату і ўмомант яе з'ядае — толькі за вушкамі трашчыць. Зараз небарака нават не варухнецца — я перашкаджаю атрымліваць асалоду ад жыцця. Аднак праз пару хвілін вожык «здаецца»: пакрысе з клубка «вырастаюць» лапкі, вельмі асцярожна паказваецца носік і «спробуе» паветра. Хутка і акуратна малы хапае «чарвяка» і задаволена чмякае. Пасля перакусу Альс недаверліва абнюхвае тэрыторыю і зноў хаваецца ў калючыя «даспехі».

— Я здзіўлена, што ён раскрыўся, напэўна, вы яму спадабаліся, — адзначае Алеся. — Звычайна перад чужымі людзьмі Альс «замыкаецца» і бурчыць...

Шмат «прыемнасцей» мы б пра сябе пачулі, калі б вожык умеў размаўляць...

**Іголкі паказваюць настрой вожыка. Калі той у гуморы, яго «шчацінкі» нагадваюць сіліконавыя — яны мяккія і складзены ў адным напрамку. Нешта не так — іголкі ідуць крыж-накрыж, такога вожыка ўжо не пагладзіш.**

## ХАЛАСЦЯК-АДЗІНОЧКА

Калі Альс такі інтраверт, як ён прывык да Алесі? Тым больш летась, перш чым трапіць у новы дом, вожык пеpажыў доўгую вандроўку ў цягніку з Віцебска (там ён нарадзіўся) да Мінска. Дзяўчына ўзгадвае: трохмесячны звярок цэлы дзень не мог апрытомнець: бесперапынна фырчаў і «страляў». Алеся пакінула калючага суседа на ноч у слоіку, каб вожык супакоіўся. Ранкам яна пачаставала небараку, і той паступова апамятаўся. Асвоіўшыся на новым месцы, ён стаў лашчыцца да новых сяброў. «Які дружалюбны наш малы», — узрадаваліся гаспадары...

Хутка Альс паказаў свой сапраўдны характар. Праз некаторы час завіталі ў госці бацькі Алесі і, вядома ж, захацелі пазнаёміцца з цікавым суседам. Вожык, учуўшы чужыя пахі, павёў сябе негасцінна: адразу ж «затрашчаў», запырхаў... Да гэтай пары Альса яшчэ ні разу не пакідалі чужым людзям, і Алеся не ведае, як ён перажыве падобную «перастаноўку». Акрамя вожыка, у доме жыве сабака па мянушцы Ліза, да якой у Альса прэтэнзій няма: ён спакойна бегае і гуляецца ў яе прысутнасці.


Алеся разам са сваім калючым сябрам, які пакуль што знаёміцца не хоча.

Вожыкі любяць быць адны, што не дзіўна з такім характарам. Нават у заводчыкаў яны не жывуць адной вялікай сям'ёй: у кожнага з іх свая тэрыторыя, свой тэрарыум. Алеся кажа, што калючыкі бываюць двух тыпаў — «злюкі» і «цікаўныя». Альс, вядома ж, адносіцца да першага тыпу. Гаспадароў ён прыняў за сваіх, перад імі можа раскрыцца ва ўсіх сэнсах. Але гэта не значыць, што яму цікава ўвесь час гуляцца з людзьмі. Каб адпачыць ад чалавечай увагі, вожык пускаецца на розныя хітрыкі. Можа прысесці, нібыта хоча ў прыбіральню: яго запускаюць у тэрарыум, а хітрун з усіх ног бяжыць хавацца ў домік. Альбо незадаволена моршчыцца і «лаецца»: «надакучылі вы мне». Іголкі паказваюць настрой вожыка. Калі Альс у гуморы, яго «шчацінкі» нагадваюць сіліконавыя — яны мяккія і складзены ў адным напрамку. Нешта не так — іголкі ідуць крыж-накрыж, такога вожыка ўжо не пагладзіш. Дый і сам ён не любіць, калі вычэсваюць яго «шчыт». Затое дазваляе гладзіць пуза на жываце.

Знаёмячыся, гаспадар мусіць браць вожыка на рукі, каб той запомніў пах свайго сябра. Калі браць малога ў пальчатках ці на ручніку, ён прывыкне да пахаў гэтых рэчаў, а не да паху вашай скуры і пасля ў голыя рукі не дасца.

## СОЧЫМ ЗА ФІГУРАЙ

Пацікаваўшы, адпраўляем Альса спаць: «пухлячок» прачынаецца а дзявятай вечара, а засынае а сёмай ранку. Вельмі зручна для гаспадыні — можна спакойна пайсці на працу, ведаючы, што твой гадаванец зараз спіць, а не разносіць ушчэнт кватэру... Хаця такія паводзіны не ўласцівы дэкаратыўным вожыкам: яны любяць паесці, у меру пагуляць са сваімі гаспадарамі і размяць лапкі!

— У прыродзе вожыкі прабягаюць за дзень каля 20 кіламетраў, — адзначае Алеся. — Дэкаратыўным таксама падабаецца гэты занятак. Бег ім жыццёва неабходны: калі звяркі не будуць шмат рухацца, могуць зарабіць атлусценне. Дарослы вожык важыць прыкладна паўкілаграма.

У тэрарыуме заўважаю трэнажор для бегу — кола. Яно большае, чым бывае ў хамячкоў: не менш за 30 сантыметраў у дыяметры, інакш вожыку было б цесна. Алеся з мужам адшукалі кола для вялікіх грызуноў, але спачатку яно рыпела — давялося мадэрнізаваць канструкцыю. Цяпер кола працуе бясшумна і нікому не перашкаджае: Альс бегае ўсю ноч, пакуль гаспадары спяць.

З домікам для вожыка давялося павазіцца. Тэрарыум замаўлялі, пасля зрабілі там «рамонт»: падлогу ўцяплілі паралонам і лінолеумам. Тут жа стаіць кармушка і паілка, а непадалёк размясцілася прыбіральня, напоўненая пілавіннем. Прыбірае ў тэрарыуме Алеся штодня: мые вадой і гаспадарчым мылам, мяняе кавалачкі флісу.

Сняданак у малога пачынаецца а дзявятай вечара. Мы ўжо ведаем, што вожыкі любяць есці заафобусаў, але яны дужа тлустыя, таму Алеся песціць Альса далікатэсам два—тры разы на тыдзень. Прусакоў, konікаў, цвыркуноў калючыкі таксама ўплятаюць з задавальненнем. Аснова іх рацыёну — варанае мяса. Сырое даваць нельга, бо могуць завесціся глісты. Альсу даспадобы дзіцячае харчаванне са смакам труса. Не адмаўляецца ён ад садавіны і гародніны — можа перакусіць кавалачкамі банана, вішні, ківі, агурка. Але вожыкі не ўсёедныя. Ні ў якім разе ім нельга даваць малако — арганізм калючкаў не ўспрымае гэты прадукт. Таксама ў забароненым спісе значацца ананас і авакада, разынкі і вінаград, арэхі і семкі. Алеся заўважыла: Альс спажывае столькі ежы, колькі яму патрэбна, абжорам яго не назавеш.


А што тут у нас на вячэру?


«Афрыканцам» абавязкова трэба шмат бегаць — інакш яны атрымаюць атлусценне.

**Пры знаёмстве гаспадар мусіць браць вожыка на рукі, каб той запомніў пах свайго сябра. Калі браць малога ў пальчатках ці на ручніку, ён прывыкне да пахаў гэтых рэчаў, а не да паху вашай скуры і пасля ў голыя рукі не дасца.**

## ВОЖЫК МОЖА СТАЦЬ КАТОМ...

Як наконт прабежкі па лужку? Гаспадыня не выпускае вожыка на вуліцу. Там паўсюль пагрозы: холад ці скразнякі альбо кляшчы ды іншыя паразіты, якіх калючы шарык прыцягвае, як магніт. Афрыканскі вожык жыве ў памяшканні і выглядае здаровым. Ёсць, праўда, працэдуры, якія ён на дух не пераносіць. Альсу страшэнна не падабаецца купацца, хаця тое і адбываецца раз на два—тры месяцы. Не любіць, калі яму стрыгуць пазногці («рытуал» праводзіцца раз на два—тры тыдні). Да таго ж Алеся часта вычэсвае Альсу іголкі зубной шчоткай. Калючык не хапае сваіх пачуццяў, а даволі актыўна выражае пратэст. У 5—6 месяцаў у вожыкаў адбываецца ліньказ іголак, а ўзімку звяркі мяняюць пушок. У параўнанні з дзікімі сваякамі афрыканскія вожыкі не ўпадаюць у спячку.

Алеся любіць назіраць за тым, як Альс накідвае на іголкі сліну — маскіруецца ад магчымай пагрозы альбо, наадварот, радуецца. Дзікія вожыкі такім спосабам абараняюцца ад розных паразітаў, у «афрыканца» ж ніякіх дадатковых сяброў няма.

Алеся адзначае: гэтых жывёл лепш не дарыць дзецям — малыя любяць пацягаць звярка за лапы ці хвост (альбо калючкі), а схільныя да стрэсаў вожыкі падобных пакут не вытрымаюць. Гадаванец скруціцца ў клубок, а дзіця, найхутчэй, параніцца аб іголкі. Тым больш, вожыкі — інтраверты, якія любяць быць сам-насам. Дый даглядаць іх не так проста: не кожны гаспадар зможа прыбіраць штодня.

Аднойчы вожык пачаў муркаць. Алеся з мужам нават перапужаліся, калі ўпершыню пачулі нехарактэрныя для выхаванца гукі, і пачалі шукаць адказ на гэтую з'яву ў інтэрнэце. Альс, не зразумеўшы, чаму ўсе вакол яго носяцца, варкатаць перастаў. Аказалася, калі вожык «ператвараецца» ў ката, то сваім жыццём ён задаволены...

Зараз малому «афрыканцу» ўжо год, і, падаецца, жыве ён шчасліва. Яго гаспадары таксама не шкадуюць, што выбралі калючага суседа. Альс — незвычайная жывёла. Сваю любоў ён цалкам аддае толькі сваім сябрам.

**Кацярына РАДЗЮК**
*radziuk@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН.**

### ЦІ БРАЦЬ КАЛЮЧЫКА З ЛЕСУ?

**Лясныя вожыкі так і спакушаюць забраць іх дадому ды пачаставаць малачком. Калі вы ўсё ж запрасілі звярка да сябе ў госці, то ведайце: ён не пераносіць малочныя прадукты, можа моцна атруціцца і нават загінуць. Лепш наліце вады ў сподачак. Наўрад ці ў вашай лядоўні знойдзецца ежа для вожыка: жабкі, слімакі і чарвякі. Не забывайцеся, што дзікія вожыкі пераносяць на сабе кляшчоў і блых, якія лёгка зачэпліваюцца паміж іголак.**